PolotskSU

**УДК 821.161**

# УВАСАБЛЕННЕ МАТЫВА «НАВАЛА-КАНТЫНУУМ» У БЕЛАРУСКАЙ МАЛОЙ ПРОЗЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ АПАВЯДАННЯ «СЕМНАЦЦАЦЬ ГОД» К. ЧОРНАГА)

***канд. філал. навук, дац. З.І. ТРАЦЦЯК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***
***z.tratsiak@psu.by***

*Артыкул прысвечаны разгляду спецыфікі ўвасаблення матыва «навала-кантынуум» у беларускай малой прозе. У якасці матэрыяла даследавання абрана апавяданне «Семнаццаць год» К. Чорнага, якое вылучаецца спалучэннем двух падыходаў да асэнсавання вайны / навалы-кантынуума. Інтэграцыя памежна сканцэнтраваных дзіцячых успамінаў з дэталёвым аповедам пра перыпетыі жыцця дарослага чалавека дазволіла адначасова шматаспектна прааналізаваць быццё беларуса ў плыні грамадска-палітычных катаклізмаў і вылучыць пэўныя агульначалавечыя праблемы, абвостраныя пачаткам Першай сусветнай вайны.*

***Ключавыя словы:*** *Першая сусветная вайна, беларуская ваенная літаратура, інклюзіўнасць, матыў «вайна / навала-кантынуум».*

Інклюзіўнасць беларускай ваеннай прозы XX ст. уяўляе сабой адметную рысу айчыннай літаратуры. Некалькі пакаленняў пісьменнікаў (узорнай у дадзеным выпадку можна лічыць спадчыну З. Бядулі, М. Гарэцкага, К. Чорнага, А. Адамовіча, В. Быкава, І. Навуменкі, У. Гніламёдава і інш.), звяртаючыся да ваенных падзей, у якіх так ці інакш удзельнічалі іх суайчыннікі, падымалі цэлы комплекс грамадска-палітычных і маральна-этычных праблем, разглядалі трансфармаванне свядомасці асобы, што напрацягу доўгага часу знаходзілася ў надзвычайных абставінах. Паступова адбывалася абагульненне адносна прыватных фактаў і пераход да тых быційных пытанняў, што маюць агульначалавечую значнасць. Адным з мастацкіх выразнікаў інклюзіўнасці стаў матыў «вайны / навалы-кантынуума» – бясконцага вязьма з войн, рэвалюцый, класавай барацьбы, рэпрэсій, экалагічных катастроф, аксіялагічнага крызісу, глыбока асэнсаванага на старонках беларускай прозы. Заўважым, што ў Беларусі на лёс аднаго пакалення найчасцей прыпадала па некалькі лакальных і глабальных узброеных канфліктаў. Таму вялікі досвед перажывання падобнай

PolotskSU

навалы спарадзіў і значную колькасную перавагу ваеннай тэмы ў беларускай літаратуры, робячы матыў «вайна / навала-кантынуум» неад’емнай часткай мастацкага твора.

Персанажы-беларусы, выразнікі галоўных аўтарскіх інтэнцый, неаднаразова ў трапнай форме фармулявалі сэнс дадзенага геапалітычнага і грамадскага феномену, які дастаткова хутка знайшоў сваё ўвасабленне на старонках раманаў, аповесцей і апавяданняў: «Дзіўна размешчана ета Беларуся наша, бытта Гасподзь знарок паклаў яе так. Усё праз нас з вайной ходзяць, усё праз нас. Здаецца, каб хто перанёс яе ў другое месца, дак і нам бы па-другому жылося» [1, с. 36]. Адначасова яны спрабавалі выкласці сутнасць асобаснага складніку дадзенага матыва: «Асэнсаваць, усвядоміць як след не паспяваеш адно, а ўжо навальваецца, захліствае ўсяго цябе другое, яшчэ больш незразумелае, жахлівае. І ты … Ні пра што іншае не думаеш, няма калі табе думаць – выратавацца б, ацалець, да берагу б якога цвёрдага прыбіцца, зноў грунт пад нагамі адчуць» [2, с. 367].

Распрацоўка гэтага матыву беларускімі пісьменнікамі мела на ўвазе і яшчэ адзін аспект: увасабленне бясконцых сацыяльных катаклізмаў успрымалася як адмысловая рэакцыя на дыскрэтнасць папярэдняй літаратуранай традыцыі, якая неаднойчы перарывалася, пакідаючы паэтам, празаікам і драматургам складаную задачу аднаўлення-працягу.

Адзначым, што распрацоўка матыва «вайна / навала-кантынуум» з часоў Першай сусветнай вайны не была выключнай прэрагатывай беларускай прозы. Айчынныя драматургі і паэты таксама далучыліся да яго мастацкага асэнсавання (драматургія і паэзія Я. Купалы, драматургічныя абразкі М. Гарэцкага, вельмі многіх пазнейшых аўтараў). Так, А. Дудараў у п’есе «Вечар» уклаў у вусны дзеда Мульціка наступную рэпліку: «Тры вайны адпляскаў, шабляй махноўцы секлі, кулакі ў трыццаць другім цвікамі на кладзішчы да крыжа прымалацілі, на фінскай нogі адмарозіў, у партызанах немцы расстрэльвалі, потым ваяваў – два разы параніла, тры разы кантузіла. І гэта яшчэ не ўсё! Двух дзетак за вайну пахаваў, і нішчымніца пасляваенная была, і хату пярун паліў, і карова здыхала, і жонка памерла» [3, с. 58]. Драматург у дадзеным выпадку адмыслова спалучыў два кампаненты навалы: агульнанацыянальны і прыватны.

Для беларускай ваеннай прозы 1920-1930-я гг. – час зараджэння і выспявання асноўных мастацкіх сродкаў увасаблення матыва «вайна / навала-

PolotskSU

кантынуум». Мастакі слова (З. Бядуля, Ц. Гартны, М. Гарэцкі, М. Зарэцкі, Я. Колас, К. Чорны) адзначылі яго глыбокую ўгрунтаванасць у нацыянальную гісторыю першай трэці ХХ ст., вылучылі асноўныя грамадска-палітычныя падзеі, якія вызначылі спецыфіку эпохі. Прыблізны пералік значных эпізодаў выглядаў так: рэвалюцыя 1905 г., руска-японская і Першая сусветная войны, нараджэнне краіны Саветаў у 1917 г., першыя гады сацыялістычнага будаўніцтва, нямецкая і польская акупацыя тэрыторый, дзе жылі этнічныя беларусы, з'яўленне Заходняй Беларусі. Акрамя адмысловай цікаўнасці да багатай на перыпетыі нацыянальнай гісторыі, пісьменнікі засяроджваліся на спалучэнні розных ракурсаў светабачання: агульнасавецкага (якому папярэднічаў расійскі вялікадзяржаўны), уласнабеларускага і прыватна-асабістага. Пісьменнікі сутыкаліся з шэрагам праблем, калі звярталіся да тэм, якія не ўхваляліся тагачаснай савецкай палітычнай элітай (зараджэнне беларускай дзяржаўнасці, класавая барацьба, нацыянальнае пытанне), ці трактавалі іх у рэчышчы, што не адпавядала запатрабаванням сацыялістычнага рэалізму «паказваць канфлікты сучаснай рэчаіснасці праз прызму гістарычнага аптымізму, адлюстроўваць іх у перспектыве грамадска-рэвалюцыйнага развіцця, маляваць велічны вобраз новага чалавека, стваральніка новага свету, рэалізатара спрадвечнай мары аб вольнай працы на вольнай зямлі» [4, с. 214]. Нягледзячы на згаданую вышэй устаноўку, у першай трэці ХХ ст. гэты матыў разглядаўся празаікамі (З. Бядуля, М. Гарэцкі, М. Зарэцкі, Я. Колас, К. Чорны) праз прызму архетыповых для беларускага пісьменства вобразаў: выгнання (бежанства), шляху, вяртання да вытокаў і роднага дому, пошукаў асобаснай і нацыянальнай ідэнтычнасці, страчанага маленства.

Неабхода адзначыць, што матыў «вайны / навалы-кантынуума» шчыльна звязаны таксама з эпапейна-хранікальным ладам мыслення асобных аўтараў. М. Гарэцкі («Камароўская хроніка») ці М. Лобан (трылогія пра сям'ю Шэметаў) не маглі лагічна завершыць аповед, бо рэчаіснасць, якую яны адлюстроўвалі, не адпускала ўжо савецкага чалавека з той ці іншай «вайны»; жыццё пастаянна прапаноўвала новыя выпрабаванні, і выключыць іх са старонак твора было немагчымым, як і спыніць узаемнае вынішчэнне людзей.

Адначасова, беларускія пісьменнікі (З. Бядуля, М. Гарэцкі, Я. Колас, К. Чорны і інш.), гранічна канцэнтруючы падзейны складнік, спрабавалі ўвасобіць матыў «вайны / навалы-кантынуума» ў творах малой формы.

Дынаміка і рознавектарнасць гістарычнага працэсу вымушала пільна абіраць асобныя эпізоды жыцця персанажа, якія ілюстравалі найбольш яскравыя праявы вайны / навалы-кантынуума. Паралельна аўтары малой прозы вырашалі пытанне пра прапарцыянальнае спалучэнне «ўнутранага» (увесь спектр эмоцый і думак, выкліканых ланцугом экстрэмальных сітуацый; заўсёдная псіхалагічная напружанасць ад усведамлення непазбежнасці і бязлітаснасці выпрабаванняў) і «знешняга» (уласна гістарычнага) кампанентаў дадзенага матыва.

Раманам «Бацькаўшчына» К. Чорны распачаў дэталёвую гаворку пра стан перманентнага супрацьстаяння, характэрнага для першай паловы XX ст. (свой працяг яна знайшла ў раманах «Трэцяе пакаленне» і «Млечны шлях», а таксама шэрагу твораў малой апавядальнай формы). Возьмем пад увагу сцвярджэнне А. Адамовіча, што «творчае развіццё К. Чорнага – працэс надзвычай актыўны і ў той жа час з заўсёднымі вяртаннямі (на іншым узроўні) назад: да знаёмых матываў, тэмаў, нават дэталяў. Кожны твор К. Чорнага – не толькі прыступка да наступнага, але і як бы матэрыял для яго» [5, с. 63]. Сыходзячы з гэтага, сцвердзім, што пісьменнік комплексна распрацаваў матыў «вайна / навала-кантынуум». Увасабленне яго для К. Чорнага мела шэраг ідэйна-тэматычных адметнасцей, бо празаік «нідзе не піша ні пра якую з войнаў і рэвалюцый XX стагоддзя … як пра канкрэтную катэгарычную веху, як пра нейкі якасны зрух на шляху чалавецтва. Для К. Чорнага гэтыя з’явы – заўсёды ў масоўцы, гэтыя катастрофы апаноўваюць беларускага селяніна гэтак няўхільна і … рэгулярна, што ён фіксуе толькі іхнюю сутнасць і вынікі ў сваім лёсе: бежанства, страта дома, смерць блізкіх, пакуты дзяцей» [6, с. 110]. Пісьменнік распрацоўваў гэты матыў як у філасофска-ўніверсальным і ў індывідуальна-прыватным, так і ў гістарычным і актуальным грамадска-палітычным рэчышчах. К. Чорны ў апавяданні «Заўтрашні дзень» заўважыў, што жыў у эпоху, «калі чалавецтва найбольш ганарылася сваёй цывілізацыяй і найбольш сыходзіла крывёй і енчыла ў пакутах з таго, што ясны розум яго занядбаў тое вялікае, што магло б быць названа сэнсам светабудовы, – гэта чалавечае сумленне» [7, с. 348].

Сама назва апавядання К. Чорнага «Семнаццаць год» адлюстроўвае спробу аўтара знайсці хаця б плыткія межы існавання сваіх персанажаў у плыні экстрэмальных падзей. Вылучаючы гэты адносна малы ў гістарычным сэнсе прамежак часу, пісьменнік максімальна насычае жыццё Пятра



PolotsSU

PolotskSU

Тадаровіча нягодамі, якія абрынуліся на шараговага беларуса ўжо на Першай сусветнай. Досвед персанажа «ўзбагаціўся» за кошт асэнсавання жахлівых праяў франтавога побыту (натуральнай рэакцыяй сталі неадчэпныя думкі пра дэзерцірства як адзіны сродак ратунку ад калецтва ці смерці), памежнага напружання фізічных і душэўных сіл у момант няцяжкага, але лёсавызначальнага ранення, выпрабавання спакусай лёгка набыць «белы білет», абзавесціся ўласным надзелам зямлі, кароткіх і марных спроб асталявацца на радзіме, пакутных бежанскіх шляхоў, на якіх персанажу наканавана страціць сям'ю, адаптацыі да жыцця ў далёкім тыле. У неспрыяльных умовах адарванаму ад радзімы беларусу было складана захаваць традыцыі, звычаі і мову. За клопатам пра выжыванне ён не паспеў перадаць сыну, што знаходзіўся пад моцным асімілятыўным уплывам, думку пра яго прыналежнасць менавіта да беларускага народа.

Намінальнае заканчэнне вайны і непазбежнае далучэнне да рэвалюцыйнай віхуры не прынесла Тадаровічу жаданага заспакаення. Ратуючыся ад адзіноты, персанаж накіраваўся дадому, каб і зноў патрапіць у экстрэмальную сітуацыю, звязаную з чарговым узброеным канфліктам: савецка-польскай вайной, якая радыкальна адбілася на лёсе яго новай сям'і. Такі быційны калейдаскоп падводзіў персанажа да стану глыбокага аксіялагічнага крызісу, калі «ён не мог знайсці ні пачатку, ні канцоў, ні прычын – нічому: ні вайне, ні смерці, ні голаду» [8, с. 261]. Адзіная, як падалося апавядальніку, больш-менш слушная выснова, якая, здаецца, магла хоць адносна ўпарадкаваць жыццё, выглядала так: «Усё робіцца само па сабе, незалежна ад яго, і яму толькі астаецца чакаць – можа, і міне яго страшная навала; ну, або старацца быць далей ад усяго і бліжэй да самога сябе; сам сабе чалавек не вораг!» [8, с. 250]. Аднак, і падобная індывідуалістычныя філасофія быцця не вытрымала выпрабавання экстрэмальнымі абставінамі. Усе перыпетыі сюжэту сцвярджалі марнасць спроб адасобіцца ад навалы, знайсці прыватнае заспакаенне.

Пераходзячы ад прыватнага да агульначалавечага, К. Чорны звяртаецца да чытача з рытарычным пытаннем: «А што такое вайна?». Літаральна адразу пісьменнік падае ёмісты адказ, які, на нашу думку, можна ўспрыняць і як адно з адмысловых аўтарскіх азначэнняў навалы-кантынуума: «Вайна таксама ўваходзіць у той жалезны шэраг няшчасцяў, што адвеку ўсталяваны і час ад часу сыходзяць на чалавецтва, як сыходзяць голад, хвароба, смерць, і кожны чалавек ратуецца і трапечацца, як можа, жывучы на свеце» [8, с. 250].

Паказальна, што К. Чорны не здавальняецца толькі версіяй матыва «вайны / навалы-кантынуума» на прыкладзе прыгод і нягод Тадаровіча. У тэксце апавядання пададзена споведзь-успамін яго сына, што сведчыць пра эксперыменты празаіка з living рознымі мастацкімі сродкамі яго ўвасаблення. У апошнім выпадку аўтар надзвычайна «спрэсоўвае» падзейную канву, пакідаючы толькі кульмінацыйныя моманты, якія ўразілі дзіця. У параўнанні з сюжэтнай лініяй Пятра Тадаровіча, у дадзеным выпадку К. Чорны не карыстаецца постаццю апавядальніка, дазваляючы персанажу самастойна рухацца па хвалях памяці, нанова вельмі эмацыйна перажываючы мінулае і спасцігаючы жудасны сэнс тых падзей. Спецыфічнай рысай гэтага эпізода трэба лічыць яго паліфанічнасць, бо, прыгадваючы трагічныя моманты, герой чуе галасы бацькоў, якія спрабавалі мінімізаваць негатыўны ўплыў абставін на свайго адзінага нашчадка. Персанаж-апавядач разважаў пра свае першыя крокі на жыццёвым шляху, але своеасаблівая дыстанцыя паміж наіўным дзіцем і дарослым не ўзнікала, бо часавая адлегласць не знішчыла боль ад загубленага маленства, не зменшыла актуальнасць тых падзей, для асобы, якая самастойна пайшла па шляху, адзначанаму подыхам навалы-кантынуума.

Сімптаматычна, што К. Чорны спалучае гэты матыў з іншымі значнымі для яго творчасці вобразамі і тэмамі: зруйнаваная навалай сядзіба, шлях, заліты крывёю ахвяр войн і рэвалюцый, вяртанне да бацькаўшчыны як крыніцы асабовай і агульнанацыянальнай ідэнтычнасці, пошукі будучыні ў свеце, які перажывае чарговы момант энтрапіі, страчанае маленства. Паралельна пісьменнік распрацоўваў і матыў уцёкаў з вайны, характэрны для беларускай прозы, прысвечанай Першай сусветнай вайне («Набліжэнне» З. Бядулі, «Сцежкі-дарожкі» М. Зарэцкага, «Бацькаўшчына» К. Чорнага). Аўтар апавядання «Семнаццаць год» падкрэсліваў ілюзорнасць спроб заключыць «сепаратны мір» і выбавіцца ад навалы, бо «яна … даганяла чалавека, не давала яму атрапаць ад яе рук! Яна гналася за чалавекам свежым следам, і нічога іншага чалавек не мог парадзіць» [8, с. 256], «як ён ні ратаваўся з таго агульнага гора, яно ўсё адно спасцігла яго» [8, с. 257].

Беларуская ваенная літаратура ў першай трэці XX ст. зазнала якасна новы этап развіцця, звязаны з аб'ектыўнай гістарычнай неабходнасцю ўвасобіць падзеі 1914–1918 гг. і нараджэння краіны Саветаў, што працягнулі пачатую Руская-японскай вайной і рэвалюцыяй 1905 г. чараду змен, канцэптуальна



PolotskSU

PolotskSU

значных для беларускіх інтэлектуалаў. Асэнсаванне нацыянальнай гісторыі заўжды ўваходзіла ў прыярытэтныя кірункі творчасці К. Чорнага. Распрацоўка матыва «вайна / навала-кантынуум» вобразна ілюстравала спецыфіку існавання некалькіх пакаленняў беларусаў. Зведаўшы рэаліі Першай сусветнай вайны, рэвалюцыі 1917 г., пісьменнік неаднаразова звяртаўся да гэтых падзей ва ўласных творах, годна сведчыў пра магчымасці беларускага мастацтва слова ў фармальным і ідэйным планах. Апавяданне «Семнаццаць год» вылучалася на фоне іншых твораў малой апавядальнай формы празаіка грунтоўным увасабленнем матыва «вайна / навала-кантынуум». Адносна невялікі аб’ём твора не перашкодзіў пісьменніку распавесці пра два лёсы персанажаў-беларусаў у плыні выпрабаванняў першых двух дзесяцігоддзяў ХХ ст., звярнуцца да асабістых, уласна нацыянальных і агульначалавечых пытанняў.

ЛІТАРАТУРА


1. Чыгрынаў, І. Плач перапёлкі / І. Чыгрынаў // Плач перапёлкі: Раман, апавяданні. – Мінск : Маст. літ., 2004. – С. 7–294.
2. Сачанка, Б. Выбраныя творы : у 3 т. / Б. Сачанка. – Мінск: Маст. літ., 1993. – Т. 1 : Вялікі Лес. Кн. 1 і 2. – 590 с.
3. Дудараў, А. Вечар / А. Дудараў // Дыялог. П’есы. – Мінск : Маст. літ., 1987. – С. 55–102.
4. Лаўшук, С. Сацыялістычны рэалізм / С. Лаўшук // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 14 : Рэле – Слаявіна. – 2002. – С. 214.
5. Адамович, А. Путь к большой прозе / А. Адамович // Горизонты белорусской прозы. – М. : Советский писатель, 1974. – С. 55–97.
6. Адамович, А. Война и деревня в современной литературе / А. Адамович. – Минск : Наука и техника, 1982. – 199 с.
7. Чорны, К. Заўтрашні дзень / К. Чорны // Выбраныя творы. – Мінск: Беллітфонд, 2000. – С. 319–366.
8. Чорны, К. Семнаццаць год / К. Чорны // Вераснёвыя ночы : Апавяданне, раман. – Мінск : Маст. літ., 2003. – С. 249–270.


## ВОПЛОЩЕНИЕ МОТИВА «БЕДСТВИЕ-КОНТИНУУМ» В БЕЛОРУССКОЙ МАЛОЙ ПРОЗЕ (НА ПРИМЕРЕ ПОВЕСТИ «СЕМНАДЦАТЬ ЛЕТ» К. ЧОРНОГО)

***З.И. ТРЕТЬЯК***

*Статья посвящена рассмотрению специфики воплощения мотива «бедствие-континуум» у белорусской малой прозе. В качестве материала исследования выбран рассказ «Семнадцать лет» К. Чорного, которое выделяется*

PolotskSU

*сочетанием двух подходов к осмыслению войны / бедствия-континуума. Интеграция предельно концентрированных детских воспоминаний с более детальным повествованием о перипетиях жизни взрослого позволила как многоаспектно проанализировать бытие белоруса в потоке общественно-политических катаклизмов, так и выделить определённые общечеловеческие проблемы, обострённые началом Первой мировой войны.*

***Ключевые слова:*** *Первая мировая война, белорусская военная литература, инклюзивность, мотив «война / бедствие-континуум».*

**SPECIFICS OF ‘CONTINUOUS WAR’ MOTIF IN BELARUSIAN SHORT STORY (BASED ON K. CHORNY’S *SEVENTEEN YEARS*)**

***Z. TRATSIAK***

*The article is devoted to the study of the specifics of ‘continuous war’ motif in Belarusian short story. K. Chorny’s story ‘Seventeen Years’ is chosen as the research material, as it is distinguished by a combination of two approaches to the concept of ‘continuous war’. The integration of exceedingly focused childhood memories with a more detailed story about the vicissitudes of adult life allowed the author to create both a multifaceted analysis of the existence of Belarusians during socio-political cataclysms and to highlight certain universal problems exacerbated by the First World War.*

***Keywords:*** *World War I, Belarusian war literature, inclusiveness, ‘continuous war’ motif.*

PolotskSU

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# МИРОВАЯ ЛИТЕРАТУРА В СТАНОВЛЕНИИ: ПЕРЕКРЕСТКИ – КОНТАКТЫ – ПОСРЕДНИКИ

Электронный сборник материалов
международной научной конференции

(Полоцк, 15–16 октября 2020 г.)

*Текстовое электронное издание*

Новополоцк
Полоцкий государственный университет
2021

Об издании – 1, 2

PolotskSU

1 – дополнительный экран – сведения об издании
УДК 82.0(100)(063)
ББК 83.0(0)я431

Рекомендован к изданию методической комиссией гуманитарного факультета
Полоцкого государственного университета (протокол № 5 от 24.05.2021 г.)

РЕЦЕНЗЕНТ:

д-р філал. навук, праф., праф. кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Л. Д. СІНЬКОВА

Ответственный за выпуск:
Е. В. Лушневская

**МИРОВАЯ ЛИТЕРАТУРА В СТАНОВЛЕНИИ: ПЕРЕКРЕСТКИ – КОНТАКТЫ – ПОСРЕДНИКИ** [Электронный ресурс] : электрон. сб. материалов Междунар. науч. конф., Полоцк, 15–16 октября 2020 г. / Полоц. гос. ун-т ; отв. за вып.: Е. В. Лушневская. – Новополоцк : Полоц. гос. ун-т, 2021. – 1 электрон. опт. диск (CD-R).
ISBN 978-985-531-774-7.

В сборник вошли научные статьи, позволяющие представить проблематику изучения истории литературы на более широком контекстуальном уровне. Актуальность тематики международной научной конференции «Мировая литература в становлении: перекрестки – контакты – посредники» подчеркивается необходимостью осмысления стремительной интеграции гуманитарных наук за последние десятилетия, приводящей зачастую не столько к положительным результатам, сколько к произвольному и неоправданному заимствованию терминологического аппарата из самых разных наук.

Предназначена исследователям, преподавателям, аспирантам филологического профиля.

*Сборник включен в Государственный регистр информационного ресурса.*
*Регистрационное свидетельство № 3172126562 от 09.09.2021.*

*Сборник входит в Российский индекс научного цитирования.*

211400, ул. Стрелецкая, 4, г. Полоцк, Витебская обл., Республика Беларусь
тел. 8 (0214) 42-87-03
e-mail: k.lushneuskaya@psu.by

**№ госрегистрации 3172126562**
**ISBN 978-985-531-774-7** ©Полоцкий государственный университет, 2021

PolotskSU

2 – дополнительный титульный экран – производственно-технические сведения

Для создания текстового электронного издания «Мировая литература в становлении: перекрестки – контакты – посредники» использованы текстовый процессор Microsoft Word и программа Adobe Acrobat XI Pro для создания и просмотра электронных публикаций в формате PDF.

**МИРОВАЯ ЛИТЕРАТУРА В СТАНОВЛЕНИИ:**
**ПЕРЕКРЕСТКИ – КОНТАКТЫ – ПОСРЕДНИКИ**

Электронный сборник материалов
международной научной конференции
(Полоцк, 15–16 октября 2020 г.)

Техническое редактирование и верстка *С. Е. Рясовой.*
Компьютерный дизайн *М. С. Мухоморовой.*

Подписано к использованию 27.10.2021.
Объем издания: 2 Мб. Тираж 3 диска. Заказ 715.

Издатель и полиграфическое исполнение:
учреждение образования «Полоцкий государственный университет».

Свидетельство о государственной регистрации
издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/305 от 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 от 08.05.2014.

211440, ул. Блохина, 29,
г. Новополоцк,
Тел. 8 (0214) 59-95-41, 59-95-44
http://www.psu.by